**Аляшковіч, І.** Загартаваны Афганам / І. Аляшковіч ; гутарыў Л. Дудараў // Дняпроўская праўда. – 2007. – 3 сак. – С. 2.

## ЗАГАРТАВАНЫ АФГАНАМ



Яго бацька быў ваенным мараком, адхадзіў па марах-акіянах восем гадоў, але па асабістых абставінах быў вымушаны змяніць ваенную службу на цывільную. Усе дзядзькі па бабулінай лініі таксама былі ваеннымі. Ігар аб гэтым добра ведаў і ўжо глыбока ў душы марыў аб прафесіі ваеннага, прафесіі ўмець абараняць Радзіму. У школе яму падабаліся ўрокі фізкультуры, гісторыі, матэматыкі, а з настаўнікаў прыкладам быў Іван Сямёнавіч Трапкоў – настаўнік матэматыкі. Строгі і тактоўны, падцянуты і разважлівы. Настаўнік імпанаваў юнаку. Пасля заканчэння сярэдняй школы Ігар Аляшковіч паступае ў ваеннае вучылішча, але праз год вучобы вымушаны пакінуць яго. Праўда, з армейскім жыццём не «завязаў». Служба ў арміі працягвалася ў іншай вайсковай часці. А распачалася яна і доўжылася два гады і чатыры месяцы далёка за межамі былога СССР – у абмежаваным кантынгенце савецкіх воіскаў на тэрыторыі Афганістана.

Успамінаць і расказваць пра гэты перыяд у сваім жыцці маёр міліцыі Ігар Міхайлавіч Аляшковіч не вельмі хоча. Пасля вяртання з той вайны на Радзіму, ён убачыў значныя перамены ў людзях і грамадскасці ў цэлым. Вось і вырашыў былы афганец паспрабаваць нешта карыснае зрабіць для гэтага грамадства. Паступіў у Акадэмію МУС Рэспублікі Беларусь. Пяць гадоў вучобы добра падмацавалі яго тэарэтычна і практычна. Служба ў праваахоўных органах сталіцы, потым перавод у Аршанскі РАУС, а адтуль – у гарадок, дзе нарадзіўся і рос, дзе з'явілася мара прысвяціць сваё жыццё служэнню Радзіме.

Аб тым, што Ігар служыў у Афганістане, бацькі не ведалі. У рэдкіх пісьмах дадому ён пісаў зусім аб іншым. Калі ж даведаліся, то зразумелі сына, асабліва бацька. Ігарам вельмі ганарыўся малодшы брат. Ігар вучыўся ў міліцэйскай акадэміі, а Сяргей адразу пасля школы і службы ў арміі паступіў у Магілёўскую школу міліцыі

– Мы раслі разам, вельмі сябравалі, тайны і мары аднаго былі тайнамі і марамі другога, – гаворыць Ігар Міхайлавіч. – Сяргей таксама марыў быць ваенным, служыць свайму народу, абараняць яго інтарэсы так, каб бацькам не было сорамна за сына. Армія дала мне шмат чаго (той, хто служыў, мяне добра зразумее). Выхавала ўпэўненасць, мужнасць, сілу волі і духа, і ў мяне, і ў Сяргея. Армія навучыла спраўляцца з цяжкасцямі. Армейская служба і загартоўка не прайшлі дарэмна, яны і ў сённяшняй службе і справах дапамагаюць.

У Ігара Міхайлавіча падрастаюць два сыны. Старэйшы Алег заканчвае віцебскі кадэцкі клас і рыхтуецца да паступлення ў Акадэмію МУС Рэспублікі Беларусь. Юнак марыць і жадае быць падобным на бацьку і дзядзьку Сяргея. Малодшы, Святаслаў, яшчэ ў трэцім класе, але і ён з гонарам пазірае на маёрскія пагоны бацькі. Ці ведае ён аб афганскай вайне, у якой удзельнічаў яго тэта? «Яму яшчэ аб гэтым рана ведаць, а мо і зусім не патрэбна», – адказвае маёр міліцыі, воін-інтэрнацыяналіст І. М. Аляшковіч.

– У майго малодшага сына цудоўнае старaславянскае імя Святаслаў, а ў спалучэнні з імем па бацьку гучыць вельмі горда – Святаслаў Ігаравіч, – сціпла усміхаючыся, гаварыць Ігар Міхайлавіч. – І калі Святаслаў выкажа жаданне прадоўжыць мой шляхі захоча служыць Радзіме, я буду за яго толькі рады.

– А, што вы, Ігар Міхайлавіч, лічыце самым галоўным у чалавеку, супрацоўніку міліцыі? – цікаўлюся ў начальніка аддзялення крымінальнага вышуку.

– Прыстойнасць, – быў кароткі адказ.

– А самае цяжкае?

– Цяжкага багата ў жыцці. Галоўнае, навучыцца і своечасова ўсе цяжкасці пераадольваць. Калі ты прыстойны і верны прысязе, на вернасць служэнню Радзіме, то любую цяжкасць можаш пераадолець.

– Жонка ваша, Вольга Яўгенаўна як ставіцца да службы мужа ў органах? Дакарае,маўляў, надакучылі дзяжурствы, начныя засады, пагоні?

– Нармальна ставіцца. Яна – мая падтрымка і апора ў жыцці. Выхаванне сыноў амаль цалкам лягло на яе плечы. За семнаццаць гадоў сумеснага жыцця ніколі не папракнула. Разумее мяне амальз паўслова. Іншы раз думаю, як яна ўсё гэта вытрымлівае? Жаночае сэрца і душа – вялікая загадка, яны бязмежныя і ў нейкай меры мы, мужчыны, за жаночай спяной, як за каменнай сцяной. Такое стаўленне мне дапамагае ў службе.

– Ігар Міхайлавіч, калі б была такая чымасць вярнуцца ў мінулае, ці змянілі б свой шлях, лес, прафесію?

– Лёс наўрад ці зменіш, бо ён дараваны Богам. Нешта, напэўна, пастараўся б змяніць. Але ў цэлым пакрочыў бы па тым шляху, які мне наканаваны па зямным шляху…

**Леанід Дудараў**

**На здымку: браты Ігар Міхайлавіч і Сяргей Міхайлавіч Аляшковічы**

**Фота А. Супрановіча**